Второй шаг — резкое обострение на международной политической арене, поиск конфронтаций с европейскими государствами, США, странами НАТО, "активная" позиция в различных конфликтах, резкие заявления, желание привлечь к себе внимание международной общественности любым скандальным способом.

Третий шаг — продолжение политики самоизоляции Беларуси, объяснение собственных провалов в политике международным давлением Европы, США на Беларусь и лично на А.Лукашенко за его "принципиальную" политику, славянское единство, объединительные процессы.

Устраивание в стране провокаций, различных взрывов, раскрытия шпионских групп, вредителей, врагов с целью установления открытой диктатуры.

Четвертый — отвлечение внимания белорусского народа от приближающегося краха авантюристского экономического курса, проводимого в течение своего правления, приведшего к резкому обнищанию народа, путем втягивания белорусского народа в надуманные референдумы и рассмотрение на них вопросов, не способных изменить жизнь людей к лучшему.

Пятый — в случае провала планов, связанных с завоеванием российского престола, попытка разыграть карту отхода от тоталитарного курса, объявив выборы, и показать Европейскому содружеству видимость готовности идти на уступки и демократические преобразования.

Чего может ожидать белорусский народ от тех шагов, которые остались у президента на пути к полному краху своей политики? Безусловно, резкого ухудшения экономики страны и своей жизни. Уже сегодня видно, что А.Лукашенко не в состоянии отойти от тех политических догм, которыми запрограммировано его поведение и обусловлены его шаги. Кодовая команда "все для победы в России", которая заложена в его подсознании, предопределила вектор действий президента: это углубление интеграции экономического кризиса союза Россия — Беларусь на ближайшие годы. Именно это единственная дорога, на которой хаотично мечется белорусский президент в последние месяцы. Новый всплеск осенней активности, подогреваемый обострением борьбы в Москве за кремлевское кресло, визиты по регионам России, приглашение в Минск губернаторов и политиков любого ранга, ничем не обоснованные и пустые обещания накормить армию России, помочь Кузбассу скупить уголь, а у Дальнего Востока доставлять рыбу, передать опыт россиянам, как стабилизировать экономику по белорусскому варианту и еще целый поток словесной шелухи указаний, как обустраивать российское государство, буквально сыпятся из уст белорусского президента на этих встречах и занимают все его воображение.

Экономика Беларуси и люди брошены на выживание, брошены, как ненужная ему ноша по дороге ЧЕМОДАН — ВОКЗАЛ — РОССИЯ.

Сегодня президент, который по Конституции является главой исполнительной власти, заявил, что он больше не будет заниматься ни посевной, ни уборочной, не будет контролировать цены в стране, это, мол, обязанности правительства. Действительно, экономика — это в первую очередь забота правительства. Но ведь все знают, что правительство шага не могло ступить без указаний президента. Все провалено по вине прежде всего президента, а теперь нужен "стрелочник".

Но есть и другой путь разрешения проблем белорусского государства и его экономики. Это путь европейской интеграции, ориентации экономики на создание производств с новыми технологиями и техникой, привлечение для этих целей внешних и внутренних инвестиций, это курс на рыночную экономику и демократизацию общества, курс на повышение жизненного уровня людей. Конкретную программу на реализацию такого курса не раз предлагал обсудить Национальный исполнительный комитет. Однако А.Лукашенко сохраняет гробовое молчание, не реагируя на эти предложения. Личные амбиции для него, по-видимому, важнее судьбы белорусского государства и его народа.

Одним из важнейших сегодня условий выживания для Беларуси — это недопущение ее самоизоляции, вычеркивания из семьи европейских государств. Самоизоляция отбросит Беларусь на долгие годы назад, заморозит ее развитие, приведет наш народ к национальной трагедии. Об этой опасности предупреждают лично А.Лукашенко и наши соседи — президенты Украины и Литвы. Ранее об этом открыто заявлял президент Польши. Именно с этой целью прибыл и вел переговоры с президентом А.Лукашенко и Верховным Советом 13-го созыва вице-президент Парламентской Ассамблеи Совета Европы Роберт Антреттер. Цель его приезда была четко им сформулирована — возвращение Беларуси к европейскому диалогу, поиск путей выхода из затянувшегося кризиса, в котором оказалась Беларусь.

Для Беларуси и ее народа еще есть возможность пойти по цивилизованному пути развития. Зависит это в первую очередь от нас с Вами.

Изменение цен на основные виды продуктов

Продукты	Цены до референдума 24 ноября 1996 г.	Цены спустя два года
Говядина 1 категории	28.800	102.800
Свинина	40.000	134.500
Колбаса вареная	32.000	144.100
Колбаса сервелат	80.000	500.000
Колбаса сырокопченая	140.000	600.000
Колбаса ливерная	12.700	88.000
Колбаса кровяная	11.400	50.000
Птица	43.000	177.800
Пельмени	11.000	40.000
Масло сливочное	43.000	172.500
Молоко, 3% жирн.	4.200	11.300 (жирн. 2,5%)
Молоко, 1,5% жирн.	Не производилось	10.400
Сыр твердый	60.000	160.000
Яйцо (десяток)	13.000	46.000
Сметана, 20% жирн.	19.000	не производится
Сметана, 15% жирн.	Не производилась	48.400
Сахар	9.600	61.500
Мука пшеничная, высш. сорт	9.000	78.000
Водка	24.000—28.000	163.000 — 190.000

Фонд Еўразія дапаможа беларускім студэнтам атрымаць адукацыю на ўзроўні міжнародных стандартаў

Прэзідэнт Фонду Еўразія Уільям Мэйнз аб'явіў аб пачатку ажыццяўлення "Праграмы універсітэцкіх партнёрстваў" — новага праекта гэтай арганізацыі для нашай краіны.

Як стала вядома карэспандэнту БелТА, "Праграма універсітэцкіх партнёрстваў" была распрацавана спецыялістамі Фонду Еўразія з мэтай прадастаўлення магчымасці новаму пакаленню беларускіх студэнтаў, якія вывучаюць эканамічныя дысцыпліны, атрымаць адукацыю ў галіне бізнесу і менеджменту ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

Канкрэтныя шляхі ажыццяўлення "Праграмы універсітэцкіх партнёрстваў" абмяркоўваліся ў ходзе асабістай сустрэчы Уільяма Мэйнза з міністрам адукацыі нашай краіны Васілём Стражавам. Паводле слоў прэзідэнта Фонду, "бакі знайшлі ўзаемаразуменне па ўсіх пытаннях, што абмяркоўваліся".

Галоўны ваенны аркестр Узброеных Сіл Беларусі возьме ўдзел у Бірмінгемскім фестывалі ваеннай музыкі

Галоўны ваенны аркестр Узброеных Сіл Беларусі пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі падпалкоўніка Аляксандра Фёдарава адправіўся ў Вялікабрытанію. Ён возьме ўдзел у міжнародным Бірмінгемскім фестывалі ваеннай музыкі — самым прэстыжным з фестываляў падобнага роду, — які пройдзе ў гэтым горадзе на працягу бліжэйшых двух тыдняў.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Міністэрства абароны краіны, за выступленнем беларускага аркестра, які ўваходзіць у пяцёрку лепшых ваенных аркестраў Еўропы, будуць назіраць каля 12 тысяч гледачоў. Усяго ў Бірмінгемскім фестывалі ваеннай музыкі возьмуць удзел 16 аркестраў з розных краін свету.

Алег САКАЛОЎ.

81 працэнт кіраўнікоў беларускіх прадпрыемстваў чакаюць у бліжэйшы час росту цэн на вырабляемую прадукцыю

Вучоныя Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Міністэрства эканомікі Беларусі апыталі больш за 200 кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія прадстаўляюць асноўныя галіны прамысловасці і формы ўласнасці.

Адказваючы на пытанне, якія змяненні чакаюцца на вытворчасці ў бліжэйшыя 2—3 месяцы, большасць прадстаўнікоў дырэктарскага корпусу (81 працэнт) указалі на рост сярэдніх цэнаў на іх прадукцыю. Іншыя паказчыкі дзейнасці прадпрыемстваў, лічаць рэспандэнты, будуць зніжацца. Так, кожны чацвёрты — 26 працэнтаў апытаных — прагназуе памяншэнне аб'ёмаў вытворчасці.

Кожны пяты чакае зніжэння занятасці на сваім прадпрыемстве (19 працэнтаў). Прыкладна такая ж колькасць рэспандэнтаў (18 працэнтаў) прагназуюць памяншэнне агульнага попыту на вырабляемую імі прадукцыю.

Па словах загадчыцы сектара ацэнкі эканамічнай кан'юнктуры названага інстытута Ларысы Хмуровіч, у ліпені гэтага года песімістычна настроеных кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў было ў два разы менш.

Леанід ІГНАЦЬЕЎ, БелаПАН.

Галерэя

Зачараваны прыгажосцю



У сталічнай мастацкай галерэі "Верхні горад" адкрылася першая пасмяротная выстава вядомага беларускага жывапісца Эдуарда Багранцава. Менавіта ў гэтыя дні мастак мог бы адзначыць свой 40-гадовы юбілей. Але выйшла інакш... Нават і не паспеўшы як след раскрыць свой бясспрэчна багаты талент, Э.Багранцаў змог стварыць сабе даволі громкае імя ў беларускім мастацтве. Трэба ўдакладніць, праўда, што гэта імя — своеасаблівае. Я ведаю: сярод сталічнай інтэлігенцыі, студэнтаў шмат паклоннікаў таленту мастака. Аднак я сутыкнуўся і з жывапісцам-прафесіяналам, які нават не чуў імя Багранцава... Выпадковасць? Можа, і не. І справа, відаць, не толькі ў тым, што Багранцаў ніколі не быў членам Саюза мастакоў, што савецкія мастацтвазнаўцы ўвесь час называлі яго не інакш як "самадзейным жывапісцам". Галоўнае, што ў Э.Багранцава свой, характэрны, не тыповы для сучаснага жывапісу стыль. Нават у гіперрэалістычных кампазіцыях мастак не "выплюхвае" фарбы на палатно, а піша скрупулёзна, грунтоўна. Аддаючы даніну фармальнаму эксперыменту ў карціне, Э.Багранцаў у большасці выпадкаў усё ж засноўвае свае работы на класічных сродках выразнасці. Я не магу адназначна назваць гэту асаблівасць ні вартасцю, ні загáнай стылю. Відавочна, што малады аўтар не выпатрабаваў многіх творчых дасягненняў жывапісу XX стагоддзя. Багранцаў — не мадэрніст. Але ж за гэта, у пэўным сэнсе, — і дзякуй Богу. Іншым разам пошук новых экспрэсіўных сродкаў і форм замінае аўтару-мадэрністу ўспрымаць адну даволі істотную рэч: прыродную прыгажосць свету... Не думаю, што перабольшыў, калі неяк назваў Эдуарда мастаком, "зачараваным прыгажосцю".

Вяртаючыся да цяперашняй экспазіцыі ў "Верхнім горадзе", хацеў бы пахваліць арганізатараў: выстава не стала механічным наборам твораў Багранцава. Кампазіцыя налічвае за трыццаць работ і дае комплекснае ўяўленне пра Багранцава-жывапісца нават для тых, хто знаёміцца з ім упершыню... Тут мы бачым сталага мастака: працы Багранцава-мaрыніста, яскрава-мінорныя зімовыя пейзажы Беларусі, велічныя замалёўкі Поўдня. Хіба няма толькі карцін з выдатнага львоўскага цыклу жывапісца (Эдуард Мікалаевіч быў родам з Львоўшчыны). Аднак багата прадстаўлены талінскі цыкл — з яго творчым пераасэнсоўваннем манеры пісьма мастакоў сучаснай Эстоніі; трапілі на экспазіцыю і некалькі работ з фантастычнага "жаночага" цыклу 1995 года...

Кажучы карацей, сёння мастак Багранцаў зноў прыходзіць да людзей. Ва ўласных творах. Як, дарэчы, сапраўднаму мастаку і належыць...

Аляксандр АДЛІВАНЧЫК.

Ну і ну!

Газетны шапік "прытуліўся" да... кацельні

Прызнацца, быў нямала здзіўлены, убачыўшы на цаглянай прыбудоўцы да кацельні санаторыя "Рассвет", куды я прыехаў на адпачынак, шыльду "Киоск "Белсоюзпечать". І было ад чаго. Па-першае, месца глухое, за частаколам соснаў, не на відавоку, па-другое, адсюль да жылога корпуса калгаснага санаторыя метраў дзвесце, да прафсаюзнага — усе пяцьсот. Не кожны з адпачываючых і знойдзе яго. Зайшоў. На прылаўку і паліцах не толькі газеты, а і розныя "ходкія" тавары паўсядзённага попыту. На відавоку амаль усе вядомыя дзяржаўныя газеты, ёсць "Свободные новости", "Навіны", "Имя" і нават "Славянскі набат". Прашу свежы нумар "Народнай волі", якую дома выпісваю з першага нумара. Прадаўшчыца, маладая ветлівая жанчына, ускідвае ў здзіўленні вочы:

— К сожалению, ее нет.

— Чаму?

— Газеты мне доставляет утром из Любани шофер санаторного автобуса, а ему передает их кто-то из районного узла связи. Почему не вкладывают "Народную волю" — не знаю.

Прашу паклапаціцца, каб завозілі. Прадаўшчыца ўважыла маю просьбу, і назаўтра я быў з "Народнай воляй". Прачытаўшы, перадаў суседзям па палаце, такім жа пенсіянерам, сябрам-аднадумцам з іншых палат. Праўда, не раз здараліся збоі ў дастаўцы, калі газеты не было на прылаўку дзень ці два запар, тады прадаўшчыца з жалем разводзіла рукамі: не ведаю, маўляў, хто забывае яе ўкласці ў кіпу газет.

Трэба зазначыць, што ў будынку калгаснага санаторыя ёсць пакойчык і ад раённага вузла сувязі, куды раніцой, прыехаўшы з Любані першым аўтобусам, заходзіць маладая дзяўчынка з жэтонамі для міжгародніх тэлефонных размоў і кіпай дзяржаўных газет, не болей 15—20 экземпляраў. На маю просьбу дастаўляць хоць пару экземпляраў "Народнай волі" яна адказала, што такое немагчыма — ёй не дадуць.

Аднойчы з'ездзіў у Любань. Там два шапікі "Белсаюздруку" — у цэнтры горада і ля аўтавакзала. У першым прадаўшчыца на просьбу прадаць свежы нумар "Народнай волі" адказала, што ўсе восем экземпляраў паспела рэалізаваць. Здзівіла, што так мала: ў горадзе дваццаць тысяч жыхароў. А нехта вызначае "норму" незалежнаму друку.

На аўтавакзале дзяўчына ў шапіку, павярнуўшыся да мяне спіною, з закутка выняла з пад стосу старых газет учарашні нумар "Народнай волі". Узяў. І пацікавіўся, чаму гэтая газета не на відавоку, на прылаўку, каб чытач яе бачыў.

— Вчерашними газетами мы не торгуем, — адказала яна на расійскай мове, быццам прыехала сюды, у палескую глыбінку, з-пад Бранска.

Мяркуючы па ўсім, камусьці ў Любані не хочацца, каб адзіная штодзённая незалежная газета даходзіла да шырокага кола чытачоў, несла праўду пра наша сённяшняе нялёгкае жыццё ва ўмовах эканамічнага крызісу і ўсё болей пагражальнай актывізацыі прыхільнікаў "единения" з Расіяй.

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

Народная Воля 25 ЛІСТАПАДА 1998 г.

От редакции

С этими результатами опроса, проведенного Независимым институтом социально-экономических и политических исследований, "Народная воля" ознакомила своих читателей в номере за 21 ноября с.г. К сожалению, при компьютерной верстке произошел технический сбой и в таблицах выпал ряд цифр, что привело к искажению данных. Исходя из этого, мы решили повторно напечатать весь материал.

Опрос

Так кто же решит наши проблемы?

Независимый институт социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ) провел недавно очередной национальный опрос в рамках проекта "Развитие информационной инфраструктуры рыночной экономики Беларуси", осуществляемого при поддержке Центра международного частного предпринимательства (CIPE, Вашингтон). Выборочная совокупность опрошенных составила 1.486 человек (предельная ошибка репрезентативности – 0,03).

Как свидетельствуют результаты опроса, на сегодняшний день перед гражданами нашей республики наиболее остро стоят проблемы, связанные с ухудшением их материального положения, снижением уровня и качества жизни.

Таблица 1.

Какие из перечисленных проблем наиболее остро стоят сейчас перед Республикой Беларусь и ее гражданами?	% от числа опрошенных
1. Рост цен	74,7
2. Обнищание населения	49,7
3. Безработица	28,5
4. Преступность	26,7
5. Спад производства	23,5
6. Коррупция	21,8
7. Последствия чернобыльской катастрофы	20,2
8. Отсутствие порядка, законности	20,0
9. Нарушение прав человека	9,9
10. Развитие связей с другими странами	8,8
11. Угроза Запада	2,7

Перед ростом цен и массовым обнищанием населения бледнеют даже такие острейшие проблемы, как преступность и коррупция, не говоря уже об угрозе Запада (которую белорусы практически и проблемой-то не считают).

Но в любой ситуации хочется верить, что безвыходных положений нет, и проблемы так или иначе будут решены. Вот только кто их решит? В принципе, тут есть варианты: во-первых, мы сами, а во-вторых, кто-то другой (государство, правительство, президент). Судя по ответам на вопросы социологической анкеты, большинство сограждан ждут решений от государства. Например, на вопрос о том, следует ли государству регулировать цены, 74,3% респондентов ответили утвердительно. Это столько же, сколько считают, что рост цен — самая большая наша проблема.

Можно ответить на рост цен и иначе — ростом заработка, личных доходов. Правда, многие сомневаются в своих возможностях больше зарабатывать, что отражено в следующей таблице.

Таблица 2.

От чего или от кого зависит Ваш заработок?	Население в целом (% от числа опрошенных)	Работники, занятые в государственном секторе экономики (% от численности группы)	Работники, занятые в негосударственном секторе (% от численности группы)
1. От решений правительства, президента, парламента	50,1	45,8	22,3
2. От работы предприятия	23,0	37,2	24,8
3. От результатов личной работы	15,2	13,2	32,2
4. От возможности подработать	14,8	15,7	19,0
5. От непосредственного начальника	11,6	17,0	14,0
6. От других обстоятельств	6,8	6,5	5,0

По мнению половины респондентов, их доходы зависят не от результатов работы предприятия и не от результатов их собственного труда, а от государственной политики, от судьбоносных решений на самом верху. В сопоставлении приведенных ответов вырисовывается известная логика: если государство отправляет зарплаты, то оно должно и регулировать рост цен, держать их в рамках приемлемого. Правда, ответы работников, занятых в государственном и в негосударственном секторах экономики, в отношении государства разительно отличаются. Первые не могут понять, что значит собственная инициатива, полагая, что их благосостояние полностью предопределено государством, тогда как индивидуалы и частники уповают прежде всего на себя и эффективность работы своего предприятия, хотя и государственные указы и декреты ставят отнюдь не на последнее место.

Для личного бюджета как тех, так и других определенное значение имеет возможность подработать, так называемая вторичная занятость.

Таблица 3.

Была ли у Вас в течение этого года, помимо основной работы, какая-либо работа, приносящая дополнительный доход?	Население в целом (% от числа опрошенных)	Работники, занятые в государственном секторе (% от численности группы)	Работники, занятые в негосударственном секторе (% от численности группы)
1. Была постоянно	12,3	13,3	19,8
2. Были случайные приработки	29,0	33,8	36,4
3. Нет, не было	57,8	52,3	43,8

Из 42,2% населения, которые имеют постоянный или временный дополнительный заработок, 7% получают его, работая по своей основной специальности, 7,4% — по другой специальности, а большинство — 27,8% респондентов — отвечали, что их дополнительная работа такова, что вообще не требует специальной подготовки. Что же это за работа, приносящая дополнительный доход почти половине граждан?

Таблица 4.

Какая работа приносит Вам дополнительный доход?	Население в целом (% от числа опрошенных)	Работники, занятые в государственном секторе (% от численности группы)	Работники, занятые в негосударственном секторе (% от численности группы)
1. Работа на приусадебном участке	29,0	31,3	13,2
2. Услуги населению (строительство, ремонт, пошив)	9,7	11,0	12,4
3. Торговля на рынке, в киосках	5,2	3,7	21,5
4. Профессиональная деятельность по контракту, заказу	4,2	4,3	15,7
5. Совместительство на том же предприятии, где основная работа	4,0	6,7	6,6
6. Посредническая деятельность, брокерство	3,3	2,3	6,6
7. Совместительство на другом предприятии	2,8	4,3	2,5
8. Производство потребительских товаров на продажу	2,4	2,9	5,0
9. Репетиторство, частные уроки	1,6	1,9	1,7

Как следует из данных, приведенных в таблице 4, основной формой вторичной занятости для населения, работающего в государственном секторе, является труд на приусадебном участке, относительно распространение получили также платные частные услуги — строительство, ремонт, пошив. Структура вторичной занятости работников негосударственной сферы экономики несколько иная: в ней доминируют торговля на рынке и в киосках, профессиональная деятельность по контракту, больший удельный вес (по сравнению с вторичной занятостью работников государственного сектора) имеют посредническая деятельность и производство потребительских товаров на продажу. Если же говорить в среднем, то безусловное предпочтение отдается самому традиционному и испытанному средству поддержать себя и свою семью — собственному клочку земли. Собираемые с него урожаи, конкурирующие с урожаем колхозов, и являются одним из тех факторов, которые хоть немного сдерживают рост цен.

Немецкая мозаика

Роль "пуфов" в жизни общества

Глава полицейского управления 83-тысячного города Бранденбурга Норберт Лангервиш обратился к местным властям с нетрадиционным предложением: открыть в Бранденбурге официальный публичный дом. С помощью такой меры, считает страж порядка, полиции станет легче контролировать криминогенную ситуацию, неизбежно возникающую вокруг области деятельности проституток. В частности, утверждает г-н Лангервиш, официально зарегистрированное увеселительное учреждение станет "более обозримым", чем восемь действующих ныне в Бранденбурге нелегальных борделей, проще будет раскрывать такие типичные правонарушения, как случаи ограбления подвыпивших клиентов. Кроме того, легально работающие проститутки будут находиться под постоянным присмотром медиков и... представителей ведомства по делам иностранцев, которым сегодня очень сложно контролировать "занятость" гастролерш из стран Восточной Европы. В своих объяснениях г-н Лангервиш ссылается на положительный опыт Кельна и Потсдама, где официально действующие публичные дома "сыграли свою положительную роль в борьбе с преступностью". Правящий бургомистр Бранденбурга Гельмут Шлизинг (SPD) обещал рассмотреть предложение шефа полиции в ближайшее время.

"Хэнди" — друг уха и враг сердца

Использование мобильных телефонов в аварийных ситуациях на дорогах часто затрудняет работу спасательных служб, утверждают эксперты из баварского отделения Красного Креста. Вместо того чтобы остановиться рядом с пострадавшим и вызвать помощь посредством установленных на автобанах аварийных колонок, водители проезжают мимо и полагают, что, позвонив в полицию или пожарную охрану с "хэнди", уже выполняют свой долг, сетует президент отделения Красного Креста. При этом водители часто не называют точного места аварии и не указывают направление дороги, затрудняя тем самым поиски пострадавших.

Медики сходятся также и в том, что радиотелефоны приносят больше вреда, чем пользы. Доказано, что постоянное использование "хэнди" нарушает электромагнитное поле человеческого организма и может привести к заболеванию сердечно-сосудистой системы. Особенно подвержены такому риску мужчины старше сорока лет. А в Берлине сенат планирует запрещение "хэнди" в общественном транспорте: мобильные телефоны вызывают нарушение функций аппаратов для снятия кардиограмм и сердечных стимуляторов больных людей, случайно оказывающихся вблизи любителя поговорить по мобильному телефону в метро или автобусе.

Под давлением памяти

Концерн "Фольксваген" создал финансовый фонд для компенсации лицам из Восточной Европы, принудительно работавшим на его заводах в годы нацизма.

Уставной капитал фонда — 20 млн. DM. "Фольксваген" пошел на этот шаг после долгих проволочек и обходных маневров. Окончательное решение было принято лишь после того, как в американских судах появились те люди, кого под страхом смерти угнали в Германию, заставив работать на гитлеровских военных заводах. Наряду с "Фольксвагеном", в этом черном списке немецких фирм фигурируют "Сименс", "Крупп", "Хенкель", БМВ, "Даймлер-Бенц", "Лейка" и другие предприятия. На "Фольксвагене" в период с 1941 по 1945 годы было занято 17 тысяч "восточных рабочих".

Капитал фонда позволит выплатить "восточным рабочим" по 4 тысячи DM за каждый месяц принудительного труда. Никто не знает, сколько из этих людей живы сегодня. Но руководство концерна пообещало, кроме того, выделить 25 миллионов DM на гуманитарные проекты в восточноевропейских странах, пострадавших от войны и нацизма.

Леонид ЧЕРЕПОВИЦКИЙ,
собственный корреспондент газеты "Народная воля" в ФРГ.

В объективе — Германия

Погожие деньки в Швабинге.

Ситуация

Участвовать в выборах или нет: последнее слово еще не сказано

Три мнения по проблеме участия или неучастия в предстоящих в будущем году выборах в местные Советы депутатов четко обозначились на прошедшей отчетно-выборной конференции Минской городской организации Объединенной гражданской партии (ОГП).

Сторонники обязательного участия в выборах на любых условиях аргументировали свою точку зрения так: любая партия борется за власть. Прийти к власти можно либо насильственным, либо мирным путем. Поскольку первый путь ОГП категорически отвергает, то остается лишь "воевать" в кабине для голосования.

Те, кто считает, что в выборах нельзя участвовать, говорили о том, что закон о выборах в муниципальные органы власти принимает нелегитимное Национальное собрание, что законопроект, который проанализировали эксперты, исключает возможность демократических и равных выборов. Да и вообще, местные Советы сегодня фактически ничего не решают, превратившись в придаток "вертикали".

Третья точка зрения состояла в том, что решение вопроса об участии или бойкоте выборов зависит от ряда условий. Если эти условия будут выполнены, то тогда есть смысл участвовать в избирательной кампании, если нет — нет резона пятнать себя. Среди них такие, как избрание новых избирательных комиссий, освобождение из тюрем политических заключенных, получение оппозицией эфира в электронных СМИ и т.д.

Последняя точка зрения получила наибольшую поддержку. В постановлении конференции "О выборах" сказано, что Минская городская организация ОГП считает основной задачей на ближайший период борьбу за честные демократические выборы. До 15 декабря решено создать штаб Минской городской и районных организаций по подготовке к проведению выборов. А до 30 декабря необходимо определиться со списком кандидатов в депутаты, "предприняв необходимые усилия для согласования со всеми основными партиями демократической ориентации единой оппозиции по поводу участия в выборах в местные органы власти и своих кандидатов".

Выступивший на конференции председатель ОГП Станислав Богданкевич сообщил, что сейчас в рамках политического совета ряда партий готовится совместное заявление о единой позиции по отношению к предстоящим выборам в местные Советы.

Дискуссия на конференции показала, что в среде делегатов есть люди, готовые идти на выборы вне зависимости от ситуации. Похоже, что именно на их амбициозность (районного и городского масштаба) и делают ставку в Администрации президента, пытаясь вовлечь в мало что дающую демократам кампанию представителей партий демократической ориентации.

На пост председателя Минской городской организации ОГП претендовали двое: Павел Козловский и Галина Юрина. Большинством голосов председателем избран генерал-полковник запаса, бывший министр обороны Беларуси Павел Козловский. Депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва Павел Данейко, который прежде возглавлял городскую организацию, теперь будет одним из трех заместителей Павла Козловского.

Владимир ГЛОД.

Палітычная кухня

Мікалай СТАТКЕВІЧ, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі

Геапалітычныя ўплывы і адзінства нацыі

Кожны год існавання незалежнай Беларусі робіць працэс усталявання яе дзяржаўнасці ўсё больш незваротным, але адсутнасць ва ўлады ўласна беларускай знешнепалітычнай канцэпцыі стрымлівае развіццё нашай краіны, наносіць урон яе нацыянальным інтарэсам. Аўтар спадзяецца, што дыскусія на гэтую тэму будзе спрыяць выпрацоўцы такой канцэпцыі.

Наша краіна знаходзіцца на мяжы дзвюх цывілізацый — усходняй і заходняй. Таму ў беларускай гісторыі амаль заўсёды знаходзіла адбітак барацьба заходніх і ўсходніх сіл паміж сабой за ўключэнне нашай краіны ў сферу свайго ўплыву. Найбольш небяспечнымі для Бацькаўшчыны былі тыя перыяды яе існавання, калі барацьба дзвюх супернічаючых цывілізацый рабілася *барацьбой беларусаў супраць беларусаў*. Зараз Беларусь зноў апынулася ў зоне магутнага адначасовага ўплыву з Усходу і Захаду. Як вынік — сацыялагічныя апытанні сведчаць аб расколе грамадства на дзве часткі. Каштоўнасцямі першай, арыентаванай на Захад (як правіла, больш маладой і адукаванай), часткі грамадства з'яўляюцца дэмакратыя, незалежнасць, рынак; каштоўнасцям другой, арыентаванай на Усход, — вяртанне ў мінулае, у СССР.

Улады краіны праводзяць палітыку, арыентаваную толькі на Усход і толькі на інтарэсы прыхільнікаў СССР. Гэта ізалюе Беларусь ад Захаду, паглыбляе раскол у грамадстве і робіць яго небяспечным для будучыні нацыі. Ва ўладаў краіны адсутнічае станоўчая стратэгія развіцця, якая б кансалідавала нацыю і дала прымальныя для ўсіх арыенціры руху Беларусі ў наступным тысячагоддзі. У гэтых умовах найбольш актыўная частка грамадства павінна сама выпрацаваць асноўныя прынцыпы такой стратэгіі, зрабіць іх прымальнымі для большасці і забяспечыць тым самым рэалізацыю такой стратэгіі на дзяржаўным узроўні.

Улічваючы высокую ступень залежнасці Беларусі ад знешніх уплываў, для выпрацоўкі прынцыпаў аптымальнай стратэгіі патрэбна асэнсаваць не толькі адметнасць нашай краіны, яе інтарэсы і прынцыповыя адрозненні ад Захаду і Усходу, але і зразумець стратэгіі гэтых дзвюх цывілізацый, матывацыю іх паводзін у дачыненні да нас.

Беларусь і Захад

Геапалітычная стратэгія лідэра Захаду — ЗША — у дастаткова вялікай ступені грунтуецца на канцэпцыях трох аўтараў: Збігнева Бжэзіньскага, Генры Кісінджэра і Сэмюэля Ханцінгтана. Разгледзім у дачыненні да Беларусі канцэпцыю апошняга з іх як найбольш *"прыгожую"*. Тым болей што канцэпцыі астатніх прынцыпова з ёй не разыходзяцца.

С.Ханцінгтан лічыць, што калі XIX стагоддзе было стагоддзем сутыкнення нацый, XX стагоддзе — сутыкнення ідэалогій, то XXI стагоддзе будзе стагоддзем сутыкнення цывілізацый. Ён называе восем цывілізацый — груп краін з рознай культурай: заходнюю, канфуцыянскую, японскую, ісламскую, хіндзі, славяна-праваслаўную, лацінаамерыканскую і афрыканскую. Мяжа паміж заходняй і славяна-праваслаўнай цывілізацыямі рассякае Беларусь і Украіну. Калі б ЗША прытрымліваліся гэтай канцэпцыі, то было б лагічна чакаць ад іх падтрымкі ў славяна-праваслаўных краінах руху іх эліт да заходніх каштоўнасцяў, спроб падштурхнуць да больш цеснага саюзу з Захадам памежныя "рассечаныя" краіны, імкнення скіраваць энергію славяна-праваслаўных краін супраць больш агрэсіўнай і небяспечнай ісламскай цывілізацыі. На мой погляд, стаўленне ЗША да вайны ў Чэчні сведчыць, што рэальная палітыка гэтай краіны праводзіцца ў рэчышчы такой канцэпцыі.

Палітыка заходнееўрапейскіх краін у адносінах да Беларусі і іншых краін постсавецкай прасторы фарміруецца ў фарватэры палітыкі ЗША, але мае свае адметнасці. Яна больш прагматычная, у сваёй аснове значна менш амбіцыйная і грунтуецца на ўнутраных патрэбах. Гэтыя патрэбы арыентуюць на пошук новых рынкаў на Усходзе, але і прымушаюць карэкціраваць эканамічную палітыку ў сувязі з пратэстамі грамадскасці супраць парушэння правоў чалавека, найперш у Беларусі. Крызіс занятасці ў вядучай краіне Еўропы — Германіі — прымушае яе шукаць рынкаў збыту сваіх тавараў на Усходзе, найперш у Расіі. Беларусь мае эканамічнае значэнне для Германіі як транзітная краіна, праз якую пралягаюць найбольш зручныя камунікацыі з Расіяй. У сувязі з пашырэннем НАТА, а таксама з крызісам у Расіі можна прадказваць большую цікавасць Захаду да Беларусі і Украіны. Дарэчы, ужо зараз дадатнае сальда Германіі ў гандлі з нашай краінай складае 300 млн. долараў ЗША.

Заходняй Еўропе сёння патрэбны ад Беларусі стабільнасць, прадказальнасць, прымальныя для яе эканамічныя ўмовы. Акрамя таго, каб задаволіць патрабаванні сваёй грамадскасці, заходнееўрапейскім урадам хацелася б, каб правячы рэжым меў хоць бы бачнасць дэмакратычнага фасаду.

Уплыў Захаду на Беларусь ажыццяўляецца праз масавую культуру і тавары масавага спажывання, якія ўжо зараз з'яўляюцца прывабнымі для большасці беларусаў. Але нельга блытаць гэтую сімпатыю з падрыхтаванасцю да засваення заходняй палітычнай культуры. Гэтая культура — з'ява унікальная, вынік усёй папярэдняй гісторыі Заходняй Еўропы. Самазнішчальныя рэлігійныя войны XVI—XVII стагоддзяў прывялі да ўсталявання ў грамадскай свядомасці неабходнасці плюралізму, а традыцыйная самастойнасць Царквы адносна дзяржавы спрыяла выхаванню крытычнага стаўлення да ўлады. Гэта і зрабіла магчымым рэалізацыю прынцыпу падзелу ўлад як асновы палітычных сістэм Захаду. Палітычнае жыццё краін Захаду вызначае пастаўленая ў межы закону барацьба асэнсаваных інтарэсаў розных сацыяльных груп.

У нас — іншая гісторыя, іншая сітуацыя. Заходняя палітычная культура ў выглядзе шляхецкай дэмакратыі і магдэбургскага права існавала ў Беларусі да канца XVIII ст. як культура шляхты і мяшчан, якія ў структуры ўсяго насельніцтва складалі не болей як 10 працэнтаў. Заходняя культурная традыцыя не паспела тады стаць набыткам большасці, а пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі яна была знішчана. Таму сучасная беларуская палітычная культура караніцца на патрыярхальнай сялянскай культуры, якая да XX стагоддзя была мала кранута знешнімі ўплывамі.

У масавай свядомасці беларусаў (як і расійцаў) іншае ўспрыняцце ўлады, чым у заходнееўрапейцаў. Па-першае, улада ўспрымаецца як нешта непадзельнае і прывязваецца да канкрэтнай асобы. Добрая ўлада — гэта значыць добры цар, прэзідэнт, першы сакратар ці прэм'ер, які павінен паводзіць сябе не як звычайны чалавек, а як правадыр, і вышэй за закон ставіць эфектыўнасць сваіх дзеянняў па "навядзенні парадку ў краіне". Прынцып падзелу ўлад не асэнсаваны грамадствам. Парламент успрымаецца большасцю народа як лішні, непатрэбны орган, які толькі замінае працаваць уладзе. Па-другое, мае месца супрацьпастаўленне вярхоўнай улады і органаў кіравання дзяржавы. У свой час пісьменнік і праваабаронца У.Караленка пісаў, што ў свядомасці сялян добры цар з'яўляецца "ворагам наяўнай дзяржавы" — паноў і чынавенства — і "знаходзіцца з імі ў пастаяннай барацьбе". Гарадское насельніцтва Беларусі было сфарміравана ў 60—70-я гг. з учарашніх сялян, таму рэлікты заўважанай Караленкам на пачатку стагоддзя з'явы адчувальныя ў Беларусі і сёння.

Безумоўна, у масавай свядомасці адбываюцца зрухі ў бок лепшага ўспрыняцця асноўных прынцыпаў дэмакратыі. Гэта звязана са зменай пакаленняў, тлумачальнай працай апазіцыі, асэнсаваннем станоўчага заходняга вопыту і ўласнага сумнага вопыту аўтарытарнага кіравання. Але яшчэ зараз менш за палову выбаршчыкаў здольныя зрабіць свой палітычны выбар асэнсавана, сфарміраваць свае ўласныя палітычныя перакананні. Так, сацыёлагі сведчаць, што 20% электарату маюць дэмакратычныя перакананні, 25—30% — антыдэмакратычныя погляды. Астатнія не маюць сфарміраванай пазіцыі і робяць свой выбар эмацыянальна, звязваючы яго з асобай палітыка, які зрабіў на іх найбольшы ўплыў.

Каштоўнасці заходняй дэмакратыі могуць быць успрыняты большасцю як неабходны дадатак да "заходняга" дабрабыту і ў гэтай якасці "прышчэплены" на беларускай зямлі. Такое ўжо адбылося ў цэлым шэрагу краін, якія не належаць да заходняй цывілізацыі. Час зноў набліжае Беларусь да Захаду.

Беларусь і Усход

Усход у дачыненні да Беларусі ўспрымаецца толькі ў якасці адной краіны — Расіі. Палітыка Расіі ў дачыненні да Беларусі фарміруецца зыходзячы з двух фактараў. Першы, аб'ектыўны фактар звязаны з нацыянальнымі інтарэсамі Расіі. Выхад у Еўропу ляжыць праз Беларусь. Страта "беларускага калідора" пагражае Расіі ізаляцыяй ад Еўропы і змяншэннем яе ўплыву на Украіну, Польшчу і Літву. Каб не дапусціць новага "санітарнага кардону", Расія павінна ўсімі сіламі трымаць Беларусь у сферы свайго ўплыву. Самым страшным для Расіі варыянтам развіцця падзей з'яўляецца ўваход Беларусі ў заходнія палітычныя ці ваенныя арганізацыі, бо гэта набліжае мяжу з Захадам аж пад Смаленск. З другога боку, поўнае паглынанне Беларусі Расіяй прывядзе да ўтварэння небяспечнай мяжы апошняй з НАТА. Таму найбольш прымальнай для Расіі сітуацыяй з'яўляецца поўны палітычны, эканамічны і культурны кантроль над фармальна незалежнай Беларуссю.

У фарміраванні расійскай палітыкі ў дачыненні да Беларусі вельмі дзейсны другі, суб'ектыўны фактар, звязаны з успрыняццем у масавай расійскай свядомасці распаду СССР як "аддзялення" ад Расіі яе ўскраін. Пачынаючы з канца XV стагоддзя, валадары Маскоўскай дзяржавы актыўна выкарыстоўвалі міф аб сваім праве на "спрадвечна рускія землі" Беларусі і Украіны. Гэтае права былых васалаў Кіеўскага княства прэтэндаваць на ўсе землі былой метраполіі выглядала на той час вельмі спрэчным. Але з цягам часу міф стаў устойлівай дамінантай у масавай свядомасці простых расіян. Таму ім вельмі цяжка ўспрыняць зараз беларусаў і ўкраінцаў як паўнавартасныя нацыі і змірыцца з існаваннем Беларусі і Украіны як самастойных дзяржаў.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Малоизвестные страницы

Когда цыгане поселились на Белой Руси

Доподлинно известно, что корни цыган тянутся от племени ведангов, живших когда-то на северо-западе Индии. Ученые, исследователи считают, что они ушли оттуда в V—X веках, т.к. в то время в Индии стал устанавливаться рабовладельческий строй, формирование которого требовало от всех жителей государства оседлости и поклонения единому верховному божеству, религии. Стремление сохранить свой образ жизни, свои верования лежало, видимо, в основе решения ведангов покинуть родину.

В начале XIV в. они появились на Крите, около 1370 г. — в Италии, в 1416 г. — в Чехии, с 1417 г. — в Венгрии. Позже цыгане приходят в Польшу и добираются аж до северного края Европы — Швеции.

У славян Восточной Европы слово "цыгане" означает "предсказатели" (искаженное названия жрецов в Греции периода раннего средневековья "ацингане").

В других местах таборное расселение цыган именовали по каким-то внешним признакам: англичане, например, нарекли их гипсами, испанцы — гитанами, греки — гюфтами, венгры — фараонами...

